***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага моваазнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

# Метадычныя асаблівасці вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання

У 2020/21 навучальным годзе навучанне беларускай мове ў II класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання будзе адбывацца па новым вучэбным дапаможніку (Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020). Вучэбны дапаможнік складзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай «Беларуская мова» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання (2017 г.). Ён распрацаваны з улікам зыходных палажэнняў *кампетэнтнаснага, лінгвакультуралагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага* і *асобасна арыентаванага падыходаў.*

Вучэбны дапаможнік уключае матэрыял, накіраваны:

1) на засваенне моўных ведаў, авалоданне нормамі беларускай літаратурнай мовы, выпрацоўку ў навучэнцаў моўных уменняў і навыкаў;

2) выпрацоўку маўленчых уменняў і навыкаў;

3) выпрацоўку камунікатыўных уменняў і навыкаў;

4) засваенне навучэнцамі беларускага маўленчага этыкету, норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін.

Першая зместавая лінія прадстаўлена звесткамі аб сістэме моўных адзінак і заканамернасцях іх функцыянавання (правілы, лінгвістычная інфармацыя для азнаямлення); практыкаваннямі, накіраванымі на выпрацоўку фанетычных, арфаэпічных, лексіка-граматычных, арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў навучэнцаў.

Другая зместавая лінія прадстаўлена практыкаваннямі, якія маюць на мэце выпрацоўку ў навучэнцаў уменняў і навыкаў аўдзіравання, чытання, гаварэння, пісьмовага маўлення. Работа па фарміраванні ўменняў навучэнцаў ствараць уласныя выказванні ў вуснай або пісьмовай форме арганізуецца на аснове аналізу ўзорных тэкстаў.

Трэцяя зместавая лінія прадстаўлена практыкаваннямі, накіраванымі на выпрацоўку ўменняў і навыкаў выкарыстання розных відаў маўленчай дзейнасці ў пэўных маўленчых сітуацыях.

Чацвёртая зместавая лінія прадстаўлена практыкаваннямі і заданнямі, накіраванымі на засваенне ветлівых слоў і зваротаў, што выкарыстоўваюцца ў розных сітуацыях зносін.

Вывучэнне беларускай мовы ў II класе пачынаецца ўступным курсам (18 г), галоўнай задачай якога з'яўляецца навучанне чытанню. На працягу ўступнага курса ўрокі маюць інтэграваны характар і праводзяцца без падзелу на ўрокі мовы і літаратурнага чытання. Адначасова з навучаннем чытанню навучэнцы авалодваюць графічнай сістэмай беларускай мовы, працягваюць практыкавацца ва ўспрыманні тэкстаў на слых, удасканальваюць вымаўленчыя навыкі. У час чытання і спісвання слоў, сказаў, тэкстаў адбываецца назіранне за графіка-арфаграфічнымі асаблівасцямі беларускай мовы. Ва ўступным курсе прадугледжана наступная паслядоўнасць практыкаванняў урока:

- чытанне слупкоў слоў з пэўнай фанетычнай асаблівасцю (словы звычайна бяруцца з тэксту, які ў далейшым будзе чытацца на ўроку);
- праца з тэкстам (слуханне, чытанне і аналіз);
- праца з прыказкамі, вершамі, загадкамі, блізкімі да тэмы твора;
- запіс невялічкіх слоў, сказаў.

Далейшае навучанне мове структуруецца па раздзелах «Гукі і літары» «Словы», «Сказ», «Тэкст».

**Раздзел «Гукі і літары» (54 г)** вырашае задачы ўдасканалення фанетычных і графічных уменняў і навыкаў навучэнцаў. Пры яго вывучэнні даецца агульнае паняцце аб гукавым саставе слова, ролі галосных і зычных гукаў у слове, удасканальваюцца правапісныя ўменні, звязаныя з напісаннем галосных у ненаціскным становішчы, абазначэннем цвёрдых і мяккіх, звонкіх і глухіх, падоўжаных зычных на пісьме. Фарміруецца ўменне правільна называць літары і карыстацца алфавітам, абазначаць гукі літарамі.

**Раздзел «Словы» (8 г)** змяшчае звесткі пра слова як лексічную адзінку мовы, як назву таго, што можа быць прадметам думкі. У навучэнцаў фарміруюцца першапачатковыя ўяўленні пра падзел слоў на часціны мовы (на лагічнай аснове: па пытанні і значэнні).

**Раздзел «Сказ» (5 г)** змяшчае звесткі пра сказ як асноўную камунікатыўную адзінку мовы. Уменні вызначаць граматычную аснову сказа на лагічнай аснове, устанаўліваць сувязь паміж словамі ў сказе выкарыстоўваюцца навучэнцамі для самастойнай пабудовы сказаў.

Вывучэнне **раздзела «Тэкст» (5 г)** мае практычную накіраванасць і забяспечвае навучэнцаў




неабходнымі ведамі і ўменнямі для актыўных маўленчых дзеянняў па стварэнні тэкстаў. Асаблівасцю вывучэння тэксту з'яўляецца тое, што ён разглядаецца як вынік маўленчай дзейнасці.

Новы вучэбны дапаможнік утрымлівае заданні, якія садзейнічаюць дасягненню вучнямі метапрадметных вынікаў навучання: развіццю ўмення прымаць і захоўваць мэты і задачы вучэбнай дзейнасці, выконваць заданні творчага і пошукавага характару, працаваць з мадэлямі і схемамі, выкарыстоўваць маўленчыя сродкі для рашэння камунікатыўных і пазнавальных задач; авалоданню лагічнымі аперацыямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі, навыкамі сэнсавага чытання тэкстаў.

Шэраг заданняў накіраваны на развіццё ў вучняў уменняў работы з рознымі крыніцамі інфармацыі на беларускай мове (інтэрнэт-рэсурсы, энцыклапедыі, слоўнікі). Такія заданні пазначаны як дадатковыя творчыя. Яны выконваюцца вучнямі па жаданні і патрабуюць папярэдняга інструктажу з боку настаўніка. Абавязкова звяртаецца ўвага на тое, што ў сетцы Інтэрнэт пажадана знаходзіць беларускамоўныя крыніцы інфармацыі, паведамленне рабіць невялікім (3–4 сказы), суправаджаць яго ілюстрацыямі і прыкладамі. Настаўніку трэба прапанаваць вучням прыклад такіх паведамленняў або ў індывідуальным парадку дапамагчы высокаматываваным вучням скампанаваць адабраны імі матэрыял у звязнае выказванне патрэбнага зместу і аб'ёму. Выкананне задання ў электронным дапаможніку патрабуе выкарыстання электронных адукацыйных рэсурсаў http://qrcode.by/3Io85. Калі ў класе маецца толькі адзін камп'ютар, праца можа быць арганізавана франтальна на ўроку або індывідуальна з асобнымі вучнямі на стымулюючых і падтрымліваючых занятках. Праграмны прадукт ЭСН «Беларуская мова. 2 клас», спасылкі на які даюцца ў вучэбным дапаможніку, можа быць спампаваны бацькамі другакласнікаў і ўстаноўлены на хатні камп'ютар. Гэта пашырыць магчымасці індывідуальнага навучання школьнікаў па-за межамі школы.

Апорныя схемы, змешчаныя на старонках дапаможніка і на форзацах, у сімвальнай форме тлумачаць асноўныя правілы, спрыяюць іх запамінанню. Рубрыка «Завяжы вузялок!» знаёміць вучняў з пэўнымі моўнымі адметнасцямі, якія засвойваюцца на практычным узроўні. Матэрыял гэтай рубрыкі не завучваецца на памяць. Пастаянны зварот да яго ў ходзе выканання заданняў па тэме спрыяе таму, што важная інфармацыя засвойваецца вучнямі на практычнай аснове.

Урокі, на якіх прадугледжваецца знаёмства са слоўнікавымі словамі, утрымліваюць шэраг практыкаванняў, у дыдактычны матэрыял якіх уключаны розныя формы слоўнікавага слова і аднакаранёвыя да яго.

Для арганізацыі кагнітыўнай рэфлексіі пасля вывучэння кожнага раздзела прапануецца рубрыка «Адкажыце на пытанні».

Практыкаванні, прызначаныя для дамашняга задання, носяць рэпрадуктыўны характар і дапамагаюць замацаваць веды і адпрацаваць уменні, атрыманыя на ўроку. Іх аб'ём адпавядае санітарным нормам.

## Распрацоўкі ўрокаў па новым вучэбным дапаможніку (уступны курс)

### Урок 1. Вывучаем беларускую мову

***Мэты:*** прыгадаць вядомыя з І класа фанетыка-арфаэпічныя і графічныя (літары ***І***, ***і***) асаблівасці беларускай мовы, адпрацоўваць навыкі вымаўлення спецыфічных беларускіх гукаў; працягваць фарміраванне навыкаў чытання і ўспрымання беларускага маўлення на слых, вучыць адказваць на пытанні па змесце праслуханага тэксту, выказвацца па-беларуску на блізкія вучням тэмы, спісваць з друкаванага і рукапіснага ўзору; развіваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы, выхоўваць любоў да Радзімы.

***Абсталяванне:*** скрыня, карткі з літарамі, малюнкі розных лавак;

карткі з заданнямі.

**І. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**1. Праца з падручнікам.**

— Прачытайце назву тэмы ўрока на старонцы 3 падручніка. Мы ўжо пачалі вывучаць беларускую мову ў першым класе. Сёння на занятках прыгадаем вядомыя вам асаблівасці беларускай мовы.

<u>Практыкаванне 1.</u>

— Разгледзьце малюнкі на старонцы 3. Назавіце па-беларуску прадметы, адлюстраваныя на іх. Якія

з названых вамі слоў вымаўляюцца аднолькава ў рускай і беларускай мовах? *(Сініца, машына, гусі, званок.)* Якімі гукамі адрозніваецца вымаўленне слоў *воўк*, *волк* у беларускай і рускай мовах? Як па-беларуску называецца *поезд*? Прачытайце спалучэнні літар у першым радку. Які асаблівы гук беларускай мовы вы вымаўлялі пры чытанні? Якой літарай ён перадаецца на пісьме? *(Вучань, які правільна назваў літару, знаходзіць картку з ёй на стале ў настаўніка, паказвае ўсяму класу і кладзе ў скрыню, якую трымае настаўнік.)* Які з адлюстраваных на малюнках прадметаў можа ўтвараць падобныя гукі? *(Цягнік.)* (Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі малюнкамі і спалучэннямі слоў. У выніку ў скрыні ў настаўніка аказваюцца карткі з літарамі ***ч, ў, ц, р, г***, спалучэннямі літар ***дж, дз***.)

<u>Практыкаванне 2.</u>

— Зараз вам неабходна дастаць са скрыні картку з літарай, знайсці ў практыкаванні 2 слупок слоў, у якім сустракаецца гэтая літара, і правільна прачытаць словы. (Вучні па чарзе дастаюць карткі са скрыні, знаходзяць і чытаюць адпаведны слупок слоў, называюць асаблівы гук беларускай мовы, які сустрэўся ў прачытаных словах. Калі адзін вучань чытае слупок слоў, астатнія сочаць за правільнасцю чытання. Пасля таго, як у прачытаных словах вылучаны спецыфічны гук беларускай мовы, настаўнік дае заданне ўсяму класу прывесці ўласныя прыклады слоў з гэтым гукам.)

<u>Практыкаванне 3.</u>

— Паглядзіце на словы першага і другога радка. У якім радку словы запісаны па-беларуску? Па чым вы здагадаліся? Напісанне якой літары адрозніваецца ў рускай і беларускай мовах? Прачытайце радок слоў, якія запісаны па-беларуску. Ці адрозніваюцца астатнія літары ў гэтых словах? Ці можаце вы прыгадаць літару, якая ёсць толькі ў беларускай мове? *(ў.)*

Перачытайце яшчэ раз беларускія словы самі сабе. Які прадмет можа называцца словам *ліст*? (*Частка расліны.* Настаўнік нагадвае дзецям, што ў беларускай мове гэтым словам яшчэ называецца пісьмо.) Што вы ведаеце пра Мінск? *(Мінск — старажытны горад. Гэта сталіца нашай краіны.)* Знайдзіце ў папярэднім практыкаванні словы з літарай **ў** і прачытайце іх яшчэ раз. Ці ведаеце вы, якія прадметы могуць называцца словам *лаўка*? (*Невялікі магазін і прылада для сядзення на некалькі чалавек у выглядзе нешырокай дошкі на слупках або ножках у парку, на вуліцы.* Пры неабходнасці настаўнік дэманструе адпаведныя малюнкі.)

<u>Практыкаванне 4.</u>

— Прачытайце сказы. Перакладзіце на рускую мову слова *ўрок (мова)*. Якое з гэтых слоў вымаўляецца і пішацца аднолькава ў беларускай і рускай мовах? Які з гэтых сказаў аднолькава вымаўляецца і перадаецца на пісьме ў рускай і беларускай мовах? *(Першы.)* Колькі слоў у гэтым сказе? Колькі слоў у другім сказе? Уважліва прачытайце другое слова ў другім сказе. Што яно абазначае? *(Вучым, засвойваем.)* Спішыце сказы. (Запіс з прагаворваннем. Самаправерка напісанага.)

**2. Выкананне задання на картках.**

Вучням раздаюцца карткі з заданнем:

| ***па-беларуску*** | ***па-руску*** |
|---|---|
| поле | лес |
| краіна | поле |
| бусел | путешественник |
| падарожнік | страна |
| Беларусь | аист |
| лес | Беларусь |

— Злучыце беларускія словы з адпаведнымі ім рускімі словамі. (Самастойнае выкананне задання вучнямі. Калектыўная праверка.) Якія словы па-рознаму вымаўляюцца і пішуцца ў рускай і беларускай мовах? *(Краіна — страна, бусел — аист, падарожнік — путешественник.)* Якую назву мае наша краіна? Разгледзьце малюнак у падручніку на старонцы 5. Апішыце бусла. *(Бусел — вялікая белая птушка з чорна-белымі крыламі, доўгімі чырвонымі нагамі і доўгай дзюбай.)* Чым прываблівае Беларусь падарожнікаў з іншых краін? (Выслухоўваюцца вусныя выказванні вучняў.)

**3. Праца з падручнікам.**

<u>Практыкаванне 5.</u>

— Паслухайце верш і адкажыце, якімі словамі аўтар характарызуе Беларусь. (Настаўнік чытае, вучні сочаць па падручніку і называюць спалучэнне слоў *непаўторны родны край*.) Знайдзіце ў вершы і прачытайце словы з гукам [р]. *(Бярозе, бярозаю, ручай, Беларуссю, непаўторны, родны, край.)* Якое з гэтых слоў вымаўляецца аднолькава ў беларускай і рускай мовах? *(Край.)* Якія асаблівыя гукі беларускай мовы сустрэліся ў словах *ручай, непаўторны*? Які доўгі гук вымаўляецца ў слове *Беларуссю*? У якім яшчэ слове з верша сустрэўся доўгі гук? *(Завецца.)* Прачытайце верш адзін аднаму ў парах. (Чытанне верша вучнямі.) Якая птушка лічыцца сімвалам Беларусі? Як вы думаеце, чаму менавіта бусел — сімвал Беларусі? (Выслухоўваюцца меркаванні вучняў.) Давайце запішам назву птушкі. (Настаўнік нагадвае алгарытм спісвання слова, вядомы вучням з урокаў рускай мовы.) А якога звера лічаць сімвалам Беларусі? *(Зубра.)* Дзе яго можна ўбачыць? *(У Белавежскай пушчы, у Бярэзінскім запаведніку, у заказніку «Азёры».)*

<u>Практыкаванне 6.</u>

— Прачытайце пытанні. (Вучні па чарзе чытаюць пытальныя сказы.) Прачытайце словы для даведкі. (Адзін вучань чытае словы.) Папрацуйце ў парах. Па чарзе задайце пытанні адзін аднаму. Дайце поўны адказ на іх, выкарыстаўшы словы для даведкі. (Для прыкладу выклікаецца адна пара вучняў. Адзін вучань чытае першае пытанне. Другі спрабуе даць поўны адказ на пытанне. Даўшы адказ, другі вучань задае наступнае пытанне першаму вучню.)

<u>Практыкаванне 7.</u>

— Прачытайце сказ. Колькі слоў у ім? Якое слова па-рознаму вымаўляецца і пішацца ў рускай і беларускай мовах? *(Родны.)* Вымавіце яго ўсе разам.

Спішыце сказ. (Настаўнік нагадвае алгарытм спісвання сказа, вядомы вучням з урокаў рускай мовы.)

**II. Вынік урока.**

— Назавіце «асаблівыя» гукі беларускай мовы. Напісанне якой літары адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах? Якой літары няма ў рускай мове? Які гук яна абазначае? Прывядзіце прыклады слоў, якія вымаўляюцца і пішуцца аднолькава ў рускай і беларускай мовах. Прывядзіце прыклады слоў, якія па-рознаму вымаўляюцца і пішуцца ў рускай і беларускай мовах.

## Урок 2. Гук [і], літары *І, і*

***Мэты:*** выпрацоўваць навык чытання па-беларуску; вучыць распазнаваць літары ***І, і***, чытаць словы з імі; фарміраваць навык напісання літар ***І, і***; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў словамі лексіка-семантычных груп «садавіна», «гародніна»; працягваць фарміраванне навыкаў успрымання беларускага маўлення на слых, вучыць адказваць на пытанні па змесце праслуханага; выпрацоўваць навык спісвання з друкаванага ўзору, арганізаваць прапедэўтычныя назіранні за правапісам вялікай літары ва ўласных назвах; развіваць пачуццё гумару.

***Абсталяванне:*** карткі з друкаванымі літарамі ***І, і***, малюнкі ката, кіта, лапы, ліпы;

карткі з заданнем.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**1. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

— Успомніце і адкажыце, напісанне якой літары адрозніваецца ў рускай і беларускай мовах. (***І, і.*** Вучань, які першым даў правільны адказ, выходзіць да дошкі, знаходзіць адпаведную літару ў касе літар або на стале ў настаўніка і выстаўляе яе на наборнае палатно.) Паспрабуйце прачытаць словы, запісаныя на дошцы (у словах карткі з літарамі ***І-і*** прымацаваны да дошкі адваротным бокам):

□гар, Пал□на, □рына, В□ктар.

У якіх з гэтых слоў прапушчана вялікая літара ***І***; маленькая літара ***і***? (Вучні, якія даюць правільныя адказы на пытанні, выходзяць да дошкі, пераварочваюць карткі і аднаўляюць словы.)

**2. Праца з падручнікам.**

<u>Практыкаванне 8.</u>

— Разгледзьце малюнкі, якія размешчаны злева ў практыкаванні. Прачытайце, як адным словам называюцца ўсе гэтыя прадметы. *(Садавіна.)* У слупку слоў знайдзіце і прачытайце назвы садавіны. У якім з гэтых слоў ёсць дзве літары ***і***? *(Вішні.)* Прывядзіце свае прыклады назваў садавіны, у якіх ёсць літара ***і***. *(Слівы, ківі.)* Разгледзьце малюнкі, якія размешчаны справа ў практыкаванні. Прачытайце, як адным словам называюцца ўсе гэтыя прадметы. *(Гародніна.)* У слупку слоў знайдзіце і прачытайце назвы гародніны. Дзе знаходзіцца літара ***і*** ў гэтых словах? *(У канцы слова.)* Прывядзіце свае прыклады назваў садавіны, у якіх ёсць літара ***і***. *(Памідоры, агуркі.)*

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Азнаямленне з напісаннем літары *І, і.***

— Сёння мы з вамі навучымся пісаць маленькую літару ***і*** і вялікую літару ***І***. Паслухайце верш і скажыце, на што падобная літара ***І***.

З плота выламана палка,
А на палку села галка
І не круціцца — ані!
Паглядзіце: вось вам — І.

*А. Вольскі**

(Выслухоўваюцца адказы вучняў.)

**2. Праца з падручнікам.**

<u>Практыкаванне 9.</u>

Звяртаецца ўвага вучняў на тое, што маленькая літара ***і*** складаецца з кароткай прамой лініі з закругленнем унізе ўправа і кропкі над ёй. Настаўнік дэманструе напісанне маленькай літары ***і*** на дошцы з каменціраваннем. Дзеці прапісваюць літару спачатку ў паветры, потым тройчы ў сшытку. Настаўнік просіць вучняў прачытаць у падручніку злучэнні з маленькай літарай ***і***. Потым ён запісвае з тлумачэннем гэтыя злучэнні на дошцы. Дзеці запісваюць злучэнні ўслед за ім, абапіраючыся на ўзор у падручніку або на дошцы. Пасля запісу калектыўна падбіраюцца і называюцца словы, у якіх ёсць запісаныя спалучэнні літар (напрыклад, *мір, налім, міг, ліліі, паўлін, міска*).

Звяртаецца ўвага вучняў на тое, што вялікая літара ***І*** складаецца з доўгай прамой лініі з закругленнем унізе ўлева, з рыскі і кропкі над ёй. Настаўнік дэманструе напісанне вялікай літары ***І*** на дошцы з каменціраваннем. Дзеці прапісваюць літару спачатку ў паветры, потым тройчы ў сшытку. Настаўнік просіць вучняў прачытаць у падручніку словы, якія пачынаюцца з вялікай літарай ***І***, растлумачыць іх напісанне. Потым ён запісвае з тлумачэннем гэтыя словы на дошцы. Дзеці запісваюць словы ўслед за ім, абапіраючыся на ўзор у падручніку або на дошцы. Пасля запісу вучні прыводзяць свае прыклады слоў, якія трэба пісаць з вялікай літары ***І*** (напрыклад, *Іванава, Іна, Ігнат*).

**III. Замацаванне.**

**1. Праца з падручнікам.**

<u>Практыкаванне 10.</u>

— Прачытайце тыя словы пад малюнкамі, якія абазначаюць адзін прадмет. У якіх з гэтых слоў ёсць літара ***і***? *(Вішня, персік.)* Дзе яна знаходзіцца? *(У сярэдзіне слова.)* Прачытайце словы, у якіх прапушчана літара. (Адзін вучань чытае словы.) Адзін ці многа прадметаў называюць усе гэтыя словы? Які гук вымаўляецца на канцы гэтых слоў? Якая літара прапушчана ў словах? Запішыце словы, якія абазначаюць многа прадметаў. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках. У час запісу дзеці падкрэсліваюць у словах літару ***і***.)

* *Вольскі, А.* Жывыя літары: Вершы : для дашк. узросту / А. Вольскі. — Мінск : Маст. літ., 1973. — С. 11.

Практыкаванне 11.

— Зараз я прачытаю вам верш, які называецца «Абжора». Каго называюць абжорам? *(Таго, хто любіць многа есці.)* Паслухайце і адкажыце, каго аўтар назваў абжорам. (Настаўнік чытае, вучні сочаць па падручніку і даюць адказ на пытанне.) Якую садавіну любіць есці бегемоцік? *(Бананы, апельсіны, мандарыны.)* У якім з названых вамі слоў пішацца літара ***і***? Як вы думаеце, які гэта верш сур'ёзны ці жартоўны? Прачытайце тыя словы верша, якімі аўтар перадае свае пяшчотныя адносіны да бегемота. *(Бегемоцік, жывоцік.)* Дзе знаходзіцца літара ***і*** ў гэтых словах? *(У сярэдзіне слова.)* У якіх яшчэ словах верша ёсць літара ***і***? Прачытайце іх.

Практыкаванне 12.

— Прачытайце адзін аднаму подпісы пад малюнкамі. (Вучні працуюць у парах.) Як адным словам можна назваць прачытаныя вамі словы? *(Гародніна.)* Зараз нам трэба будзе «сабраць» у кошык толькі тую гародніну, у назвах якой ёсць літара ***і***. Прачытайце адпаведныя словы. (Адзін вучань чытае патрэбныя словы.) Запішыце спачатку тыя словы, якія заканчваюцца літарай ***і***. (Запіс на дошцы і ў сшытках. У час запісу дзеці падкрэсліваюць у словах літару ***і***.) *Зараз* запішыце словы з літарай ***і*** ў сярэдзіне. (Запіс на дошцы і ў сшытках. Праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Практыкаванне 13.

— Назавіце прадметы на малюнках. Дапоўніце сказы словамі. У якім з гэтых сказаў у кожным слове ёсць літара ***і***? *(У першым.)* Колькі слоў у гэтым сказе? Спішыце яго. (Запіс з каменціраваннем.) Колькі слоў у другім сказе? У якіх словах гэтага сказа ёсць літара ***і***? Якое слова сказа складаецца з адной літары? Запішыце гэты сказ. (Запіс з каменціраваннем.)

**2. Калектыўная праца на дошцы і ў сшытках.**

На дошцы вывешваюцца малюнкі, пад імі запісваюцца словы з пропускамі:



к..т



к..т



л..па



л..па

— Якія літары трэба ўставіць у словы? (Вучні, якія даюць правільныя адказы на пытанне, выходзяць па чарзе да дошкі і дапісваюць патрэбныя літары ў словы.)

Настаўнік раздае вучням карткі з незакончанымі сказамі:

| |
|---|
| У моры жыве __________ .<br>Каля дома расце __________. |

— Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з тых, што запісаны на дошцы. (Дзеці выконваюць заданне самастойна. Пасля настаўнік дае ўзор правільнага выканання на дошцы. Вучні абменьваюцца карткамі, арганізоўваецца ўзаемаправерка.)

**IV. Інфармаванне аб дамашнім заданні.**

Практыкаванне 14.

**V. Вынік урока**

— Напісанне якой літары адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах? Які гук яна абазначае? (На дошцы запісваюцца асобныя элементы літары ***і*** маленькай, ***І*** вялікай. Настаўнік просіць дзяцей дапісаць літару ***і*** (маленькую, вялікую). Дзеці па чарзе выходзяць да дошкі, дапісваюць літару, прыводзяць свой прыклад слова, у якім ёсць літара ***і*** або ***І***.)

## Урок 3. Гук [і], літары *І, і*

***Мэты:*** выпрацоўваць навык чытання па-беларуску; адпрацоўваць навыкі распазнавання і напісання літар ***І, і*** ў словах; арганізаваць прапедэўтычныя назіранні за правапісам вялікай літары ва ўласных назвах; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў словамі лексіка-семантычных груп «садавіна», «гародніна»; працягваць фарміраванне навыкаў успрымання беларускага маўлення на слых, вучыць прагназаваць змест тэксту па загалоўку і ілюстрацыі, адказваць на пытанні па змесце праслуханага, выказвацца па-беларуску на блізкія вучням тэмы; выпрацоўваць навык выбарачнага спісвання з друкаванага ўзору; выхоўваць любоў да прыроды.

***Абсталяванне:*** малюнкі айвы, бручкі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце скорагаворку з дамашняга практыкавання. (Адзін вучань чытае ўслых.) Вымавіце яе правільна і хутка адзін аднаму. (Вучні працуюць у парах.) Якія словы вы выпісалі? *(Агуркі, буракі.)* Дзе ў гэтых словах знаходзіцца ***і***? *(У канцы слова.)* Назавіце агуркі і буракі адным словам. *(Гародніна.)* Вялікая ці маленькая літара ***і*** ёсць у гэтым слове? Запішыце гэтую літару. (Адзін вучань запісвае літару на дошцы, астатнія — у сшытках.) Запішыце слова гародніна. (Запіс з каменціраваннем на дошцы і ў сшытках. Падкрэсліванне літары ***і***.)

**II. Замацаванне.**

**1. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 15.

— Прачытайце назву верша і разгледзьце малюнак. Як вы думаеце, пра якую пару года пойдзе размова ў творы? *(Пра восень.)* Дакажыце сваю думку. Паслухайце верш і скажыце, ці пацвердзіліся вашы меркаванні. (Настаўнік чытае верш, вучні сочаць па падручніку і пераконваюцца, што іх меркаванні былі правільнымі.) Ці ўсе словы ў вершы былі вам зразумелыя? (Пры неабходнасці настаўнік дэманструе малюнкі айвы, бручкі.) Як вы разумееце словы «і ўсё — дарма»? *(Бясплатна, за нішто.)* Чаму садавіна і гародніна едуць

у «восеньскім лімузіне»? *(Таму што ўвосень ураджай з палёў, садоў і агародаў часта вязуць дадому ў машынах.)* Палічыце, колькі слоў з літарай ***і*** сустрэлася ў вершы. *(16.)* У якім слове верша ёсць дзве літары ***і***? *(Лімузіна.)* Знайдзіце ў вершы і прачытайце назвы гародніны. (Адзін вучань чытае.) Запішыце гэтыя словы ў сшытках пасля слова *гародніна*. (Запіс на дошцы і ў сшытках з каменціраваннем. Графічнае выдзяленне літары ***і***. Аналагічна зачытваюцца і запісваюцца з новага радка словы — назвы садавіны.)

Практыкаванне 16.

— Прачытайце тэкст. (Адзін вучань чытае, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) Дзе жыве бабуля Мішы і Мілы? Чаму гэтае слова напісана з вялікай літары? *(Назва горада.)* Што вы ведаеце пра Іванава? (*Горад у Брэсцкай вобласці.* Калі вучні самі жывуць у Іванава, то можна запытацца ў іх пра славутасці роднага горада.) Перачытайце сказы, у якіх ёсць словы з літарай ***і***. (Вучні па чарзе зачытваюць сказы, потым запісваюць *з каменціраваннем на дошцы і ў сшытках першы сказ, у якім чатыры словы з літарай* ***і***.)

Практыкаванне 17.

— Прачытайце першы слупок слоў, дапаўняючы іх гукам [і]. (Адзін вучань чытае.) Назавіце адным словам. *(Імёны.)* Якое слова лішняе? Прачытайце другі слупок слоў. Якое слова лішняе? Прачытайце трэці слупок слоў. Назавіце адным словам. У якія прачытаныя словы трэба ўставіць вялікую літару ***І***? Запішыце іх. (Запіс з каменціраваннем.)

Успомніце і назавіце вядомыя вам назвы гарадоў і вёсак Беларусі, у якіх ёсць літара ***І, і***. (Можна правесці спаборніцтва паміж радамі. Вучні па чарзе называюць геаграфічную назву, вызначаюць месца літары ***і*** ў названым слове. Той рад вучняў, які не зможа назваць патрэбнага слова, выбывае з гульні. Перамагаюць тыя вучні, якія апошімі назвалі слова з ***і***.)

Практыкаванне 18.

— Прачытайце загадку. (Адзін вучань чытае, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) Якую адгадку мае загадка? *(Іголка.)* Запішыце яе. (Той вучань, які першым назваў адгадку, запісвае яе на дошцы. Астатнія працуюць у сшытках.) Пра якую іголку ідзе размова ў загадцы? (*Пра швейную.* Вучні паказваюць яе на малюнку.) Якія жывёлы маюць іголкі? Якія расліны маюць іголкі?

Практыкаванне 19.

— Прачытайце скорагаворку. (Адзін вучань чытае, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) Хто такі налім? Які ён? Што значыць слізкі? *(Тут: гладкі, выкрутлівы.)* Якіх яшчэ рыб вы ведаеце? *(Карп, плотка, лінь, сіг і г. д.)* У якіх названых вамі словах пішацца літара ***і***? Прачытайце скорагаворку адзін аднаму. Папрактыкуйцеся хутка і правільна вымаўляць яе. (Дзеці працуюць у парах, потым настаўнік выслухоўвае некалькі вучняў.) Назавіце ў скорагаворцы словы з літарай ***і***. У якіх словах ёсць дзве літары ***і***? Запішыце іх. (Самастойны запіс вучнямі слоў *лавілі, слізкі.* Узаемаправерка.)

**III. Інфармаванне аб дамашнім заданні.**

Практыкаванне 20.

**IV. Вынік урока.**

— Напісанне якой літары адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах? Які гук яна абазначае? Прывядзіце прыклады слоў, якія пачынаюцца з маленькай літары ***і*** (з вялікай літары ***І***).

## Урок 4. Апостраф

***Мэты:*** выпрацоўваць навык чытання пабеларуску; вучыць распазнаваць і пісаць надрадковы знак апостраф у словах, правільна чытаць і спісваць словы з ім; працягваць фарміраваць уменні асэнсаванага ўспрымання беларускага маўлення на слых і пры чытанні; адпрацоўваць алгарытм спісвання з друкаванага і рукапіснага ўзору; развіваць граматычны лад маўлення, кемлівасць, добразычлівыя адносіны паміж аднакласнікамі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце запісаную скорагаворку. Вымавіце яе правільна і хутка адзін аднаму. (Вучні працуюць у парах. Потым настаўнік выслухоўвае некалькі вучняў.) Колькі слоў у скорагаворцы? У якіх словах ёсць літара ***і***? Якое слова самае кароткае? Якое слова самае доўгае? *(Тканіна.)* Якія імёны дзяўчынак «схаваліся» ў гэтым слове? *(Ніна, Іна.)* У якім з гэтых слоў трэба пісаць маленькую літару ***і***? Запішыце гэтую літару. (Адзін вучань запісвае літару на дошцы, астатнія — у сшытках.) Якую літару ***І*** трэба пісаць у слове *Іна*? Запішыце яе. (Запіс на дошцы і ў сшытках.) Запішыце слова *Іна*. (Запіс з каменціраваннем на дошцы і ў сшытках.)

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

На дошцы запісаны сказы:

1) Я пью кефир.

2) Я п’ю кефір.

— Прачытайце сказы. Які сказ запісаны пабеларуску? Па чым вы здагадаліся? (Настаўнік выцірае сказ, запісаны па-руску.) Напісанне якой літары адрозніваецца ў рускай і беларускай мовах? (Адзін вучань выходзіць да дошкі і падкрэслівае беларускую літару ***і***.) Успомніце і скажыце, як называецца знак, што сустрэўся ў слове *п’ю*. (Дзеці спрабуюць прыгадаць патрэбную назву. Пры неабходнасці настаўнік нагадвае, што гэты надрадковы знак называецца апострафам. Адзін вучань выходзіць да дошкі і падкрэслівае яго ў слове.)

**III. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 21.

— Прачытайце словы. Разгледзьце малюнак у падручніку. Якім з гэтых слоў можна падпісаць малюнак? Вымавіце ўсе разам слова *вераб’і*. Назавіце па парадку гукі ім. (Вучні паслядоўна вылучаюць у слове гукі [в’][э][р][а] [б][й][і́].) Які гук вымаўляецца пасля [б]? Паглядзіце яшчэ раз на слова *вераб’і* і скажыце, які знак стаіць пасля літары ***б***.

Знаёмства з матэрыялам рубрыкі «Завяжы вузялок!».

Настаўнік чытае вучням матэрыял рубрыкі і задае пытанні: што такое апостраф? Які гук вымаўляецца пры чытанні на месцы апострафа?

Практыкаванне 22.

— Сёння мы з вамі навучымся пісаць словы з апострафам. Прачытайце першае слова ў першым радку. *(Б'е.)* На якой лініі рабочага радка пішацца апостаф? *(На верхняй.)* Сапраўды, апостраф пішацца так: ставіцца кропка на верхняй лініі рабочага радка, ад яе ўніз вядзецца невялікае плаўнае закругленне. Паспрабуйце прапісаць гэты знак у паветры разам са мной. (Дзеці прапісваюць апостраф у паветры.) Яшчэ раз уважліва паглядзіце на слова *б'е*. Ці злучаюцца паміж сабой пры пісьме літары, паміж якімі пішацца апостраф? *(Не.)* Паглядзіце ўважліва, як я напішу слова *б'е*. (Настаўнік запісвае з каменціраваннем. Дзеці пішуць услед за ім, падкрэсліваюць апостраф у слове. Аналагічна прачытваюцца і запісваюцца астатнія словы.)

Практыкаванне 23.

— Прачытайце словы першага (другога, трэцяга) слупка. (Тры вучні па чарзе чытаюць словы.) Які знак ёсць ва ўсіх словах? Перачытайце словы першага слупка. Што іх аб'ядноўвае, акрамя апострафа? *(Усе яны звязаны з яздой.)* Прачытайце словы другога слупка. Якія з гэтых слоў адрозніваюцца адным гукам? *(Б'е — п'е.)* Прачытайце словы трэцяга слупка. Якое з іх лішняе? Дакажыце сваю думку. Складзіце сказ з адным словам на выбар. (Выслухоўваюцца адказы вучняў.)

Практыкаванне 24.

— Прачытайце верш. (Некалькі вучняў чытаюць верш уголас. Астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) Што такое апостраф? Знайдзіце адказ на пытанне ў вершы і прачытайце. *(Гэта знак.)* Удакладніце, які гэта знак. *(Надрадковы.)* Прачытайце словы з апострафам. Запішыце іх. (Самастойнае выкананне задання вучнямі. Узаемаправерка.)

Практыкаванне 25.

— Прачытайце загадку. (Адзін вучань чытае ўголас, астатнія сочаць за правільнасцю чытання.) З літар складзіце слова-адгадку. Які жолуд па памеры? *(Маленькі.)* З чым аўтар параўноўвае яго па велічыні? Знайдзіце і прачытайце, як аўтар вобразна гаворыць пра тое, што з жолуда вырастае дуб. Знайдзіце ў загадцы слова з апострафам. Запішыце яго. (Запіс з камеціраваннем.)

Практыкаванне 26.

— Паслухайце верш. (Настаўнік чытае верш, вучні сочаць па падручніку.) Якіх птушак зблытаў Вася? Як дзеці здагадаліся, што хлопчык частаваў вераб'я? Як яны адрэагавалі на расказ Васі? Якія словы ў вершы падказалі вам, што аднакласнікі палічылі паведамленне хлопчыка выдумкай? *(«Рассмяшыў сягоння ў класе нас сваёю байкай Вася».)* У якіх сітуацыях чалавеку не бывае крыўдна чуць смех у адказ на свае словы? *(Калі ён расказаў смешную гісторыю, жарт.)* Калі ён можа пакрыўдзіцца? Знайдзіце ў вершы і прачытайце словы з апострафам.

Практыкаванне 27.

— Дапоўніце кожны сказ патрэбным словам з правага слупка. (Вучні аднаўляюць сказы.) Колькі слоў у кожным сказе? У якім з гэтым сказаў больш слоў з апострафам? Назавіце іх. *(Вераб'я, сям'я.)* Запішыце сказы. (Запіс з каменціраваннем на дошцы і ў сшытках. Падкрэсліванне апострафа ў словах.)

**IV. Інфармаванне аб дамашнім заданні.**

Практыкаванне 28.

**V. Вынік урока.**

— Які надрадковы знак ёсць у беларускай мове? Які гук вымаўляецца пры чытанні на месцы апострафа? Прывядзіце ўласныя прыклады слоў з апострафам.